# «ДОБРАЯ ДУМКА ПРА ЧАЛАВЕКА —



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вядома, сёння сітуацыя і жыццё прыкметна змяніліся. Сёння часам можна пачуць аб хрысціянах зусім іншае: «Глядзі, як сябе паводзіць, а яшчэ праваслаўны!». Людзі, далёкія ад Царквы, сёння чакаюць ад вернікаў амаль роўнаанёльскага жыцця, суцэльную любоў і добрае стаўленне адно да аднаго і асабліва да іх. Мы стараемся не асуджаць такіх людзей і не крыўдзімся на іх, бо любоў і дабрыню прапаведаваў Хрыстос Збавіцель. Ён, нават знаходзячыся на крыжы, маліўся за сваіх распінацеляў.

Адказваючы на ваша пытанне, мне вельмі цяжка вызначыць нейкія асаблівасці ў людзей, якія маюць розныя нацыянальныя карані, няхай гэта будуць беларусы, рускія ці ўкраінцы. Усе мы — славяне. У нас адзін Бог, адна Царква, адна вера, адзін алфавіт, адна культура. У нас адзін генетычны код. Так, напрыклад, у сям'і брат і сястра могуць любіць розную музыку, хтосьці захапляецца тэхнікай, а хтосьці — жывапісам, так і ў нацыянальнасцях. Аднак ад гэтага яны не становяцца чужымі, а працягваюць заставацца роднымі людзьмі. Сёння нашу славянскую сям'ю спрабуюць штучна падзяліць, ды яшчэ і пасварыць. І да таго часу, пакуль мы будзем захоўваць духоўнае адзінства ў Хрысце, ва ўлонні Царквы Хрыстовай, мы будзем заставацца вялікай духоўнай праваслаўнай сям'ёй.

**«Убачыў малады чалавек дзяўчыну, спадабалася яна яму вонкава, а потым пачынае знаёміцца з ёй бліжэй, а там, глядзіш, і пакахалі адно аднаго, а потым і злучыліся на ўсё жыццё».**

***— Зараз нярэдка сустракаецца такое, што для веруючага чалавека абрадавы бок веры становіцца важнейшым за яго ўнутранае, духоўнае жыццё.***

— Бянтэжыцца такім становішчам не варта, але разумець сітуацыю трэба. І пастыры, ведаючы пра гэта, павінны імкнуцца выпраўляць яе. Многія людзі прыходзяць у праваслаўныя храмы таму, што ім знешне нешта спадабалася: архітэктура, харавы спеў, богаслужэнне, пропаведзь. Можа быць, першы раз чалавек зайшоў у храм дзеля цікавасці, але хто ведае, можа быць Гасподзь такім чынам заклікае яго да Сябе. Можа быць, праз нейкі час гэты чалавек пачне глыбей знаёміцца з жыццём Царквы, а потым зацікавіцца і багаслоўскімі пытаннямі. Трэба сказаць, што такія працэсы — частая з'ява. Як адбываецца ў звычайным жыцці? Як часта ствараюцца сем'і? Убачыў малады чалавек дзяўчыну, спадабалася яна яму вонкава, а потым пачынае знаёміцца з ёй бліжэй, а там, глядзіш, і пакахалі адно аднаго, а потым і злучыліся на ўсё жыццё.

Прыкладна такое ж адбываецца і з абрадавым бокам жыцця нашай Царквы. Жыццё ў Царкве мае знешні і ўнутраны складнік. Знешні, абрадавы бок мае важнае значэнне, але ён не галоўны. Звярніце ўвагу — многія літургічныя дзеянні ў нас называюцца таінствамі. Гэта значыць, за знешнімі дзеямі святаром здзяйсняецца нешта таямнічае, тое, што чалавек не бачыць, але адчувае. Мы не бачым Благадаць Святога Духа, але Яна дзейнічае і жыватворыць кожнага, хто мае веру і прыступае да таінстваў з пакорай. Знешні бок не павінен станавіцца самамэтай, але і без яго мы абысціся не можам. Калі хтосьці больш звяртае ўвагу на абрадавы бок, то ў гэтым выпадку пастыр павінен растлумачыць, што для нас галоўнае, а што другараднае.

***— А што вас прывяло да веры?***

— У нас у сям'і тата быў чалавекам няверуючым — перакананым атэістам, хоць і нарадзіўся ў сям'і святара. Так склалася, што ў тыя, ужо далёкія, паслярэвалюцыйныя гады ўсіх дзяцей з сем'яў святароў, чыіх бацькоў высылалі ў лагеры, адпраўлялі ў прытулкі, а там начыста выбівалі з іх веру. Праўда, у канцы жыцця мой тата ўсё ж прыйшоў да Бога. А мама была чалавекам веруючым. У нас у сям'і было, калі так можна выказацца, два супрацьлеглыя бакі.

У пасляваенны час у горадзе Карагандзе, дзе мы жылі, служыў адзін з апошніх опцінскіх манахаў — айцец Севасціян. Тады ён быў простым іераманахам, які адбыў ссылку ў сталінскіх лагерах ды так і застаўся на ўсё жыццё ў Карагандзе. У 1996 годзе схіархімандрыт Севасціян быў далучаны да ліку святых. Яго малітвамі Гасподзь здзяйсняў мноства цудаў, і мы, тады яшчэ зусім маладыя людзі, бачылі гэта і, вядома, убіралі ў сваё душы ўсё, што адбывалася вакол нас. Магу прывесці маленькі прыклад. Здзяйсняе бацюшка паніхіду і памінае імёны з запісак. Раптам спыняецца і пытаецца: «Хто падаў запіску аб супакаенні такога? Ён жывы». А гэты чалавек з вайны не прыйшоў, і ўсе думалі, што ён памёр. На самай справе мужчына ляжаў у шпіталі і не пісаў лісты, каб не засмучаць блізкіх, а праз нейкі час вярнуўся дадому.

У нашай сям'і хварэла маці. Ёй аднойчы зрабілі найскладанейшую аперацыю. У яе выздараўленне дактары не верылі. Непрытомнае цела мамы на каталцы адпіхнулі да ўвахода ў морг. А бацюшка якраз у гэты момант рыхтаваўся здзяйсняць літургію і, убачыўшы, што ўваходзіць у храм сяброўка мамы, паклікаў яе і сказаў: «Насця, вось табе прасфара і святая вада. Бяжы хутка да Анечкі ў бальніцу, хай з'есць прасфару і пап'е святой вады, а мы будзем зараз маліцца». Насця ўсё так і зрабіла. На здзіўленне дактарам, мама засталася жывой і з часам пайшла на папраўку.



Разам з айцом Севасціянам маліліся і падвізаліся манахіні, якія, як і ён, былі сапраўднымі падзвіжнікамі і нават валодалі адмысловымі благадатнымі дарамі, мелі дар празорлівасці. Калі я вырашыў паступаць вучыцца ў Маскоўскую духоўную семінарыю, у адной гутарцы са мной матушка Агнія парэкамендавала добра падрыхтавацца. «У цябе ёсць настольны каляндар?» — спытала яна мяне. — Куды ты хочаш ехаць паступаць?» «У лаўру прападобнага Сергія Раданежскага», — адказваю. «А які там галоўны храм?» — задае пытанне манахіня. «Троіцкі сабор», — кажу. «А трапар Святой Тройцы ведаеш? Трэба ведаць. Вывучы, спатрэбіцца. А трапар прападобнаму Сергію Раданежскаму ведаеш? Вывучы, спатрэбіцца. А 50-й Псалом ведаеш?» Кажу: «Ведаю». «Прачытай», — кажа яна. «Памілуй мяне, Божа, па вялікай міласці Тваёй і па мностве шчодрасцяў Тваіх...» — чытаю. «Ну ўсё, даволі, даволі, — ківае матушка. — А 90-й псалом ведаеш?» «Ведаю. Той, хто жыве з дапамогаю Усявышняга, пад покрывам Бога Нябеснага...» — пачынаю чытаць. «Ну ўсё, даволі, даволі, — усміхаецца яна. — А лічбы царкоўнаславянскія ведаеш, па-царкоўнаславянску чытаць умееш?» Я пачынаю чытаць і яна зноў: «Ну, хопіць, хопіць». Потым пачала лічбы пытацца па чарзе. «Нядрэнна, нядрэнна, ты добра падрыхтаваўся, так, глядзіш, і адразу ў другі клас паступіш», — кажа яна. Потым спытала, чым цяпер займаюся. А я тады вучыўся ў прафтэхвучылішчы, і трэба было пасля яго прайсці адпрацоўку. І расказаў ёй, што гарадскім дзецям можна было лёгка атрымаць дыплом і не ехаць на адпрацоўку ў калгас. «А дыплом дадуць?» — пытаецца. «Дадуць», — адказваю.

Калі прыехаў у семінарыю і здаў усе экзамены, пайшоў глядзець вынікі. На стэндзе вывесілі спісы тых, хто паступіў, але мяне ў іх не аказалася. Спускаюся на другі паверх і чую, што нехта называе прозвішчы. Падыходжу, пытаюся, чым магу дапамагчы, можа быць, кагосьці паклікаць. «А як тваё прозвішча?» — пытаецца бацюшка. «Панамароў», — кажу. «Бягом да інспектара ў кабінет!» Іду, заходжу да яго ў кабінет, там камісія чалавек з 15. Спыталі маё прозвішча, імя, а потым адзін з іх пачынае пытацца ў мяне слова ў слова, як матушка, у той жа чарговасці: пра галоўны храм, трапары Святой Тройцы і прападобнаму Сергію Раданежскаму, псалмы 50-й і 90-й, папрасіў пачытаць па-царкоўнаславянску і лічбы назваць. Усе словы — адзін у адзін як матушка пыталася. І на ўсе мае адказы, пытаючы, бацюшка рэагаваў аднолькава: «Ну, хопіць, хопіць». А потым і пра дыплом і адпрацоўку спыталі. Хіба не цуд? І, паверце, у маім жыцці такіх прыкладаў мноства.

**«Мы не бачым Благадаць Святога Духа, але Яна дзейнічае і жыватворыць кожнага, хто мае веру і прыступае да таінстваў з пакорай».**

***— І ўсё ж такі сэнс хрысціянскага жыцця — гэта перш за ўсё любоў. Як яе варта праяўляць?***

## 7 АСАБІСТЫХ ПЫТАННЯЎ

***— Як зразумець, дзе дабро, дзе зло?***

— Як па пладах можна даведацца пра дрэва, так і па справах чалавека можна даведацца, дабро гэта ці зло. Разважаючы з прыхаджанамі, я часта рэкамендую кожнаму пратэсціраваць сябе, хто ж я ёсць на самай справе. У пасланні апостала Паўла да Галатаў ёсць выдатныя думкі пра плады духу. Гэта «... любоў, радасць, мір, доўгацярплівасць, дабрыня, міласэрнасць, вера, лагоднасць, устрыманне» (Гал. 5, 22—23). Калі ў мяне ёсць гэтыя добрыя якасці, то значыць, я на выратавальным шляху. А калі іх няма, а толькі справы плоці, пра якія кажа апостал Павел: «Учынкі плоці вядомы, вось яны: пралюбадзейства, блуд, нечыстата, разбэшчанасць, ідаласлужэнне, чарадзейства, варожасць, сваркі, зайздрасць, гнеў, звады, раздоры, [спакусы], ерасі, нянавісць, забойствы, п'янства, бясчынствы і таму падобнае; папярэджваю вас, як і раней папярэджваў, што тыя, хто робіць так, Царства Божага не ўнаследуюць» (Гал. 5, 19—21).

***— Як вы адпачываеце?***

— Для мяне вялікім суцяшэннем з'яўляецца богаслужэнне. Успамінаю маму. Яна мне казала, што я адпачываць не ўмею, як усе людзі. А я схаджу на службу, а ўжо тым больш калі сам служу, адразу прыліў сіл адчуваю. Упэўнены, што гэта Гасподзь падмацоўвае. Целам часам стамляешся, а душой заўсёды адпачываеш.

***— Самы дарагі падарунак, які вам зрабілі бацькі?***

— Па-першае, яны падарылі мне жыццё! Падругое, іх жыццё для мяне яркі і непаўторны ўрок і прыклад. Я да гэтага часу памятаю, што яны ніколі не высвятлялі адносіны пры дзецях. Часам тата на працы затрымаецца, а ў мамы спраў безліч, ёй дапамога патрэбна: «Зараз прыйдзе бацька дадому, я яму ўсё выкажу!» — пагарачыўшыся, казала мама. Тата прыходзіць, мама пачынае яму нешта казаць, а хвілін праз дзесяць чуем — яны смяюцца. Яна яму папрок — ён ёй жарт або анекдот. Тата ўмеў звесці ўсё на жарт. Таму і сварак у іх сур'ёзных ніколі не было. Мудрыя былі бацькі.

***— Без чаго не можа жыць хрысціянін?***

— Вядома, без Бога.

***— Што можа ўпрыгожыць ваш дзень?***

— Можна гэта зрабіць самому. Раніцай прачнуўся, звесіў ногі з ложка і сказаў: «Слава Айцу, і Сыну, і Святому Духу. Слава Табе Божа, што я жывы. Навучы мяне, Госпадзі, выконваць волю Тваю». Потым ранішняя малітва. У плыні дня вельмі важна навучыцца бачыць у кожным чалавеку вобраз Хрыста. Тады кожная сустрэча з кім пажадаецца будзе радасцю.

***— Якая кніга змяніла вашае жыццё?***

— Безумоўна, Евангелле. Калісьці я захапляўся кнігамі пра ваенных лётчыкаў, ды і сам хацеў ім стаць, шмат чытаў пра Івана Кажадуба, Аляксандра Пакрышкіна. А потым даведаўся, што лётчыкам можа стаць толькі камсамолец, а ў той час гэта азначала адмовіцца ад Бога. Таму адразу кінуў думаць пра гэта. Ужо пасля службы ў войску на мяне надзвычайнае ўражанне зрабіла кніга «Маё жыццё ў Хрысце» святога праведнага Іаана Кранштацкага.

***— Як зразумець, што жывеш правільна?***

— Варта часцей зазіраць у свой унутраны свет і справядліва ацэньваць свае ўчынкі. Даваць бесстароннюю ацэнку свайму жыццю, часцей звяртацца да голасу сумлення. На шляху самапазнання, вядома ж, павінен быць непарушны арыенцір — Евангелле. Праз прызму Евангелля можна лёгка вызначыць і добрае, і злое.

Увечары, кладучыся ў ложак, успомні, што сёння зрабіў? Калі было нешта добрае, скажы: «Госпадзі, слава Табе! Хоць нешта зрабіў з Тваёй дапамогай». А калі зрабіў нешта не тое ці дрэннае, не забудзься сказаць: «Прабач мне, Госпадзі, і дапамажы выправіцца». І пастарайся выправіцца. І так кожны дзень. Толькі так можна прыйсці да добрых вынікаў у духоўным жыцці.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.